# Як кіраваць сучаснай універсітэцкай бібліятэкай

**У пачатку сакавіка ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага універсітэта прайшоў семінар-нарада дырэктараў бібліятэк ВНУ Мінска на тэму "Праблемы кіравання бібліятэкай ВНУ ва ўмовах трансфармацыі вышэйшай прафесійнай адукацыі".**

Рэктар БДАТУ М.У.Казаравец, які выступіў з прывітальным словам, адзначыў, што бібліятэка незаменная ў інфармацыйным забеспячэнні навуковага і вучэбнага працэсу ў ВНУ, і падкрэсліў, як многа залежыць ад дзелавых і асобасных якасцей непасрэдна кіраўніка бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У праграму семінара было ўключана выступленне дырэктара бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў А.В.Валодзінай, прысвечанае пабудове сістэмы кіравання ведамі ў бібліятэках вышэйшых навучальных устаноў. Укараненне такой сістэмы павышае прэстыж бібліятэкі за кошт хуткай адаптацыі да зменлівых умоў, дазваляе аператыўна рэагаваць на новыя інфармацыйныя патрэбы карыстальнікаў, удзельнічаць у стварэнні і пастаянным развіцці канкурэнтных пераваг ВНУ на рынку адукацыйных паслуг.

Дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта П.М.Лапо закрануў найбольш актуальныя пытанні менеджменту якасці бібліятэкі ВНУ, прывёў прыклады айчыннага і замежнага вопыту.

Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі таксама кадравыя праблемы, пытанні ўзаемадзеяння бібліятэкі з іншымі падраздзяленнямі ВНУ, падзяліліся вопытам індывідуальных стыляў і метадаў кіравання.

**Падрыхтаваў Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**